# ТЭАРЭТЫЧНЫ АСПЕКТ ГЕАПАЛІТЫКІ: СУСВЕТНЫ І БЕЛАРУСКІ ВОПЫТ

**Я. А. Нікіфарава[1], А. В. Дземідовіч[2]**

*[1] Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, Мінск, Беларусь, yananikifarava@gmail.com*
*[2] Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, Мінск, Беларусь, dzemhelen@mail.ru*

Артыкул прысвечаны тэарэтычнаму аспекту і гісторыі геапалітыкі. Мэтай артыкула з'яўляецца даследаванне генезісу геапалітыкі ў свеце і ў Беларусі. Адзначаюцца найбольш істотныя аўтары і іх канцэпцыі, якія зрабілі ўклад у развіццё і станаўленне геапалітыкі. Аналізуецца трактоўка пэўных геапалітычных канцэпцый і тэорый міжнароднай супольнасцю. Выяўляюцца ўзаемасувязі фундаментальных работ у сферы геапалітыкі і ўзаемны ўплыў аўтараў на даследаванні ў дадзенай сферы. Даследуецца катэгарыяльны апарат геапалітыкі. Аналізуецца ўзаемасувязь беларускай геапалітычнай тэорыі з непасрэдным геапалітычным становішчам краіны. Адзначаюцца асаблівасці беларускай геапалітычнай парадыгмы.

***Ключавыя словы:*** геапалітыка; знешняя палітыка; катэгарыяльны апарат; Рэспубліка Беларусь; тэорыя

# THEORETICAL ASPECT OF GEOPOLITICS: GLOBAL AND BELARUSIAN EXPERIENCE

**Ya. A. Nikifarava[a], A. D. Dzemidovich[b]**

*[a] Belarusian State University*
*Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus, yananikifarava@gmail.com*
*[b] Belarusian State University,*
*Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus, dzemhelen@mail.ru*
*Corresponding author: Yana Nikifarava (yananikifarava@gmail.com)*

The article is devoted to the theoretical aspect and history of geopolitics. The purpose of the article is to examine the genesis of geopolitics worldwide and in Belarus. The most significant authors and their concepts that influenced the development of geopolitics are mentioned. The interpretation of some geopolitical concepts and theories by the international community is analyzed. Connections between fundamental works in the sphere of geopolitics and mutual influence of the authors in this very sphere are determined. The Categorical apparatus of geopolitics is examined. The birth of the Belarusian geopolitical thought and its problems are studied. Connections between the Belarusian geopolitical theory and its geopolitical position are analyzed.

***Keywords:*** geopolitics; foreign policy; categorical apparatus; the Republic of Belarus; theory.

У актуальнай міжнароднай сітуацыі тэрмін «геапалітыка» гучыць усё часцей. На жаль, з прычыны папулярызацыі паліталагічных і аналітычных матэрыялаў сярод масавай аўдыторыі, дадзеная з'ява часта набывае суб'ектыўную канатацыю ў залежнасці ад таго, хто яе прэзентуе, а таксама ў залежнасці ад мэтавай аўдыторыі. Безумоўна, трактоўка тэрміна «геапалітыка» з моманту з'яўлення яго ў міжнародным тэрміналагічным апараце адрознівалася, што залежыла ад разнастайных фактараў. Менавіта таму важна падыходзіць да разумення феномена геапалітыкі з навуковага пункту гледжання, пазбавіўшыся суб'ектыўна-эмацыянальнай афарбоўкі, характэрнай часам для масавай інфармацыйнай прасторы. Для гэтага трэба звярнуцца да тэарэтычнага аспекта геапалітыкі і яе гісторыі. Цікава адзначыць у сувязі з гэтым наступны парадокс: спекуляцыя тэрмінам «геапалітыка» ў негатыўным ключы часцей за ўсё абапіраецца якраз на пэўныя гістарычныя этапы развіцця гэтага паняцця (а менавіта на геапалітычныя канцэпцыи эпохі нацыянал-сацыялістычнага рэжыму ў Германіі).

На самай справе прататыпы сучасных геапалітычных канцэпцый з'явіліся яшчэ ў старажытным свеце. Гэта былі раннія геапалітычныя ўяўленні, якія звязвалі палітычныя, гістарычныя і геаграфічныя (у прыватнасці, кліматычныя) з'явы. Такія погляды сустракаюцца ў работах кітайскага філосафа Лао-цзы, у прыватнасці, у яго канцэпцыі Сярэдзіннай імперыі, а таксама прыцягнення малых дзяржаў вялікай [1, с. 63]. Залежнасць правядзення палітыкі ў розных сферах ад ландшафта апісвалася ў старажытнаіндыйскім палітычным і эканамічным трактаце «Артхашастра» (прыкладна II—III стст. да н.э.) [2, с. 382—391]. Некаторыя антычныя аўтары таксама разглядалі ўздзеянне геаграфічных фактараў на палітыку і грамадства. Сярод такіх аўтараў Герадот, Арыстоцель, Ксенафонт.

Перыяд Асветніцтва і Новага часу адзначыўся замацаваннем геапалітычнай парадыгмы ў гуманітарных даследаваннях, якія факусаваліся на палітычных працэсах. У першую чаргу гэта адбылося дзякуючы Ж. Ж. Русо, Ш. Мантэск'ё, Д. Дзідро. Пра неадназначнасць успрыняцця геапалітыкі і яе даследаванняў ужо на дадзеным этапе сведчыць тое, што палітыка-прававы трактат Ш. Мантэск'ё «Аб духу законаў» (1748 г.) быў уключаны ў Індэкс забароненых кніг (1751 г.). У гэтай рабоце Ш. Мантэск'ё найбольш паслядоўна распрацаваў канцэпцыю геаграфічнага дэтэрмінізму [3, с. 356—410]. Праз геапалітычную прызму можна таксама разглядаць трактат І. Канта «Да вечнага міру» (1795 г.) [4]. У адным з дадаткаў да гэтай работы — «Аб гарантыі вечнага міру» — філосаф у якасці гарантыі вечнага міру прыводзіць прыроду. І. Кант разглядае розныя прыродныя асяроддзі і іх уплыў на становішча міжнародных адносін. Так, напрыклад, мора, згодна з канцэпцыяй Канта, «спрыяе не толькі пачашчэнню кантактаў паміж людзьмі і развіццю гандлю, але і ўсталяванню міру» [4, с. 28—44].

І хаця непасрэдна тэрмін «геапалітыка» быў уведзены ў навуковы зварот Р. Чэленам толькі на пачатку XX ст. пад уплывам кнігі нямецкага географа Ф. Ратцэля «Палітычная геаграфія», фундаментальныя работы, у якіх выяўляўся ўплыў геаграфічных фактараў на грамадска-палітычнае жыццё і гісторыю, з'явіліся яшчэ раней. Безумоўна вартай згадвання ў дадзеным кантэксце з'яўляецца грунтоўнае даследаванне К. Рытэра «Землязнаўства ў дачыненні да прыроды і гісторыі чалавецтва». Географ па адукацыі, Рытэр прытрымліваўся канцэпцыі геаграфічнага пасібілізму — адаптацыі чалавечага грамадства да прыродных умоў. Даследчык характарызаваў фізіка-геаграфічную будову краіны як вызначальны фактар гістарычнага працэсу кожнага народа. Менавіта К. Рытэру належыць тэрмін «жыццёвая прастора» (ням. *Lebensraum*), які стаў адной з асноўных канцэпцый геапалітыкі і актыўна выкарыстоўваўся ў далейшым Ф. Ратцэлем. Дарэчы, менавіта канцэпцыя жыццёвай прасторы часцей за ўсё падвяргаецца крытыцы за «цынічнасць», бо ў яе аснове ляжыць ідэя аб тым, што дзяржава натуральным чынам імкнецца да пашырэння сваёй тэрыторыі — гэта тэорыя, актыўна распрацаваная нямецкім даследчыкам К. Хаўсхоферам, была выкарыстаная А. Гітлерам для абгрунтавання сваёй агрэсіўнай палітыкі ў Еўропе і свеце. Так, у палітычным слоўніку, выпушчаным у СССР у 1987 г., дэфініцыя тэрміна геапалітыка мае выключна негатыўную канатацыю, са спасылкай у тым ліку на паняцце «жыццёвая прастора»: «Нямецкія геапалітыкі шырока прапагандавалі ідэі рэваншызму, агрэсіі і “жыццёвай прасторы германскай нацыі”» [5, с. 88].

Вяртаючыся да К. Рытэра, варта адзначыць, што як географ, ён асаблівай увагай надзяляў структуру зямной паверхні, якая, як актыўна адзначаў навуковец, багатая на дыферэнцыяцыю на складнікі: кантыненты, іх ускраіны і берагавыя абрысы. Рытэр выявіў два тыпы раздзялення кантынента: вертыкальнае і гарызантальнае. У якасці найбольш уплывовага для развіцця грамадства і, у прыватнасці, культуры, навуковец адзначаў фактар мараплавання, якое, у сваю чаргу, залежыць ад ступені развітасці берагавой лініі. Якраз такім чынам тлумачыцца вышэйшая ступень развіцця культуры Еўропы ў параўнанні з Афрыкай. Ускраіны еўразійскага мацерыка, згодна з Рытэрам, з'яўляюцца «акружнасцю кантынентальнага кальца», і менавіта па кірунку ад сярэдзіны да ўскраін адбываецца развіццё цывілізацый [6]. Пры азнаямленні з гэтай канцэпцыяй К. Рытэра відавочным становіцца ўплыў яго работ на пазнейшых прадстаўнікоў геапалітыкі: так, чарговай важнай канцэпцыяй геапалітыкі з'яўляецца «Хартлэнд» — сярэдзінная зямля — па сутнасці, масіўная паўночна-ўсходняя частка Еўразіі, акружаная з поўдня і ўсхода горнымі сістэмамі, — тэрмін, агучаны ў 1904 г. брытанскім прафесарам Х. Дж. Маккіндэрам і які хутчэй за ўсё сыходзіць каранямі менавіта ў канцэптуальныя распрацоўкі К. Рытэра.

Развіваючыся і ўзбагачаючыся разнастайнымі канцэпцыямі і даследаваннямі, геапалітыка набыла ўласны катэгарыяльны апарат, азнаямленне з якім неабходна для паўнавартаснага разумення. Так, галоўнымі катэгорыямі геапалітыкі з'яўляюцца:

1) падкантрольная прастора, альбо геапалітычнае поле, якое таксама мае ўласную класіфікацыю ў залежнасці ад канкрэтных характарыстык: эндэмічнае поле, якое знаходзіцца пад кантролем і кіраўніцтвам дзяржавы працяглы час; пагранічнае поле, якое з пунктаў гледжання дэмаграфіі, эканомікі і палітыкі з'яўляецца недастаткова развітым; перакрыжаванае поле — прастора, на якую прэтэндуюць некалькі сумежных дзяржаў; татальнае поле, якое ўяўляе сабой суцэльны масіў, дзе, безумоўна, дамінуе тытульная нацыя; геапалітычная апорная кропка — месца (тэрыторыя) за межамі татальнага поля, якое кантралюецца пэўнай дзяржавай, пры тым што камунікацыі і падыходы да яго кантралююцца іншымі дзяржавамі (напрыклад, Калінінградская вобласць як апорная кропка Расіі ў Еўропе); метаполе, якое з'яўляецца суверэннай тэрыторыяй і асвойваецца некалькімі краінамі;

2) геапалітычны разлом — устойлівае сістэмнае супярэчанне паміж цывілізацыямі, эканомікамі, этнасамі, нацыянальнымі культурамі;

3) баланс сіл — становішча, калі ніякая з дзяржаў не ў стане дабіцца аднабаковых пераваг і вымушана ўлічваць інтарэсы супернікаў, імкнучыся пры гэтым парушыць раўнавагу на сваю карысць;

4) сусветны парадак — агульнапрызнаная сістэма міжнародных сувязяў і адносін з дакладным размеркаваннем роляў у іерархіі;

5) палітычная мяжа. Гэтая катэгорыя геапалітыкі звязаная перш за ўсё з праблемай барацьбы за розныя формы кантролю над палітычнай прасторай. [7, с. 322—326].

Праблема мяжы даследавалася брытанскім лордам Дж. Н. Керзанам (1859—1925 гг.), які, з'яўляючыся віцэ-каралём Індыі, вывучаў вопыт праводзення межаў, які практыкаваўся ў азіяцкіх краінах. Ім адзначалася адсутнасць фіксаваных межаў, якія ў цэлым характэрныя пераважна для краін Еўропы. Менавіта Дж. Н. Керзан выступаў за стварэнне буферных зон у выпадку сутыкнення дзяржаў з памежнымі канфліктамі [8, p. 280].

Да другасных катэгорый геапалітыкі можна аднесці нацыянальны інтарэс і, адпаведна, механізмы рэалізацыі нацыянальных інтарэсаў дзяржавы. Азнаямленне з катэгорыямі геапалітыкі дастаткова, каб зразумець, што рэалістычны падыход да міжнародных адносін шмат у чым апелюе да геапалітычных канцэпцый.

Найбольшы інтарэс для нас уяўляе руская школа геапалітычнай думкі, бо канцэпцыі, якія прапаноўвалі даследчыкі і мысліцелі, часта наўпрост ці ўскосна закраналі і лёс сучаснай тэрыторыі нашай краіны — менавіта пад уплывам геаграфічнага і гістарычнага фактараў. Акрамя гэтага, для цэласнага разумення актуальнай геапалітыкі варта звярнуцца да гіста-

рычнай рэтраспектывы. Адметнай асаблівасцю работ рускай школы геапалітычнай думкі з'яўляецца пераважная літаратурнасць, метафарычнасць і мастацкасць, уласцівая асноўным чынам работам М. Бярдзяева. Па сутнасці, работы аўтара нельга аднесці да тэорыі геапалітыкі ў прамым яе разуменні, але філасофскія канцэпцыі М. Бярдзяева так ці інакш закранаюць праблемнае поле геапалітыкі. Асобнае месца М. Бярдзяеў адводзіць культурным каштоўнасцям, схіляючыся да таго, што ў геапалітычным плане ў Расіі на працягу доўгай гісторыі не было і не магло быць блізкіх, заснаваных якраз на агульных культурных каштоўнасцях саюзнікаў [9, с. 31]. Згодна з поглядамі Бярдзяева, выкладзенымі ў яго рабоце «Лёс Расіі» (1918 г.), Расія, асвойваючы велізарную па памеры еўразійскую прастору, фарміравалася як самастойны, з элементамі ўласнай цывілізацыі, унікальны свет. І для Захаду, і для Усходу Расія заставалася далёкім ад іх культурным утварэннем. Адметнай рысай работ Бярдзяева, як і іншых прадстаўнікоў расійскай геапалітычнай думкі, з'яўляецца часты зварот да маральна-духоўных катэгорый, а таксама да паняцця каштоўнасцяў і гарманічнае іх перапляценннне з асноўнымі геапалітычнымі катэгорыямі.

У той жа перыяд, што і «Лёс Расіі» М. Бярдзяева, з'явілася работа беларуса І. Абдзіраловіча (Канчэўскага) «Адвечным шляхам» (1921 г.). Для Беларусі гэта быў час асаблівай разгубленасці і спробаў пошуку ўласнага шляху як нацыі і дзяржавы. «Адвечным шляхам» можна ахарактарызаваць як філасофска-геапалітычны трактат, у якім мысліцель разважае над месцам Беларусі і беларусаў у свеце з пункту гледжання геаграфічнага становішча, якое, згодна з І. Канчэўскім, мае вялікі ўплыў на светапогляд і самаідэнтыфікацыю беларусаў. Асноўны матыў «Адвечным шляхам» — ваганне, нявызначанасць беларусаў паміж умоўнымі Захадам і Усходам: «Дзесяцівекавое ваганне сведчыць аб тым, што беларусы, як украінцы і балканскія славяне, не маглі шчыра далучыцца ні да аднаго, ні да другога кірунку. Мы не зрабіліся народам Усходу, але не прынялі і культуры Заходняй Еўропы» [10].

Нягледзячы на геапалітычную «абгортку» праблемы, работа «Адвечным шляхам» больш закранае пытанні нацыянальнай самасвядомасці і ідэнтычнасці беларусаў, якія, аднак, цесна звязаныя менавіта з асаблівасцямі геапалітычнага становішча краіны.

Па сутнасці, гэты геапалітычны матыў знаходжання Беларусі паміж Захадам і Усходам захаваўся да сучаснасці і пачаў трактавацца як перавага ў кантэксце палітычных і эканамічных працэсаў. Часта ў дачыненні да сучаснай Беларусі выкарыстоўваецца тэрмін «мост». У адпаведнасці з гэтым бачаннем геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь з'яўляецца спрыяльным для пасрэдніцтва ў вырашэнні разнастайных канфліктаў. «Нявызначанасць», якая ў адмоўным святле разгубленасці прадстаўлена ў рабоце «Адвечным шляхам», у сучаснасці фактычна набыла адценне асаблівасці беларускага народа і дзяржавы.

З набыццём нашай краіны незалежнасці і станаўленнем Рэспублікі Беларусь як суверэннай дзяржавы актывізаваўся навуковы зварот да праблемы асэнсавання месца і ролі краіны ў свеце. Гэтае асэнсаванне адбывалася ў тым ліку і ў геапалітычнай парадыгме. Сярод беларускіх аўтараў, якія асвятлялі дадзеную праблему ў сваіх працах, можна назваць І. І. Антановіча, У. А. Бабкова, М. Л. Гайдукевіча, А. М. Данілава, А. С. Кізіму, В. М. Мацаля, А. У. Русаковіча, У. Е. Снапкоўскага, А. В. Ціхаміравa, М. Э. Часноўскага, А. В. Шарапу, У. В. Фральцова. Аб'ектам даследавання пералічаных аўтараў з'яўляецца, сярод іншага, альбо знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь і геапалітычныя тэндынцыі сучаснасці, якія ўплываюць на фарміраванне палітыкі беларускай дзяржавы, альбо выклікі глабалізацыі, якія трасфармуюць сістэму міжнародных адносін.

Маючы асаблівыя адносіны з Расіяй і знаходзячыся ў непасрэднай геаграфічнай блізкасці з ёй, Беларусь часткова існуе ў расійскай геапалітычнай парадыгме, што робіць тэарэтычны аспект расійскай геапалітыкі даволі актуальным для беларускай дзяржавы. Пры гэтым адметнай рысай уласнабеларускай геапалітычнай парадыгмы з'яўляецца своеасаблівае апярэджанне практыкай тэорыі: маючы ўнікальнае геапалітычнае размяшчэнне на скрыжаванні сусветных шляхоў, Беларусь перш за ўсё імкнецца выкарыстаць у сваёй знешняй палітыцы перавагі ад свайго становішча. Яшчэ ў ліпені 2004 г. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка агучыў афіцыйны падыход беларускай дзяржавы да правядзення знешняй палітыкі зыходзячы з яе геапалітычнага становішча: «Беларусь размешчана на вельмі чулым геапалітычным скрыжаванні. Аб'ектыўна — гэта бласлаўленне для дзяржавы і народа: мы знаходзімся на засяроджанні гандлёвых і транзітных шляхоў» [11]. У геапалітычным становішчы Беларусі кіраўнік дзяржавы бачыў магчымасць для дасягнення стратэгічнай мэты краіны — зніжэння ўразлівасці эканомікі і прадухілення знешнепалітычных рызыкаў, якія з яе вынікаюць. Такі падыход да правядзення знешняй палітыкі ў адпаведнасці з геапалітычнымі асаблівасцямі толькі ўкараніўся з узмацненнем міжнароднай напружанасці ў XXI ст. У лістападзе 2020 г. А. Р. Лукашэнка ў адным з публічных выступленняў акцэнтаваў увагу на тым, што Рэспубліка Беларусь здольная рабіць канструктыўны ўклад у вырашэнне разнастайных праблем. «З улікам сваёй няпростай гісторыі і геапалітычнага становішча наша краіна вельмі зацікаўлена ў неканфліктным і эфектыўным супрацоўніцтве з іншымі краінамі...» [12]. Напэўна, самым дакладным выражэннем асаблівасцяў беларускай знешняй палітыкі з улікам геапалітычнага становішча з'яўляецца наступнае выказванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь: «Беларусь — гэта дом у цэнтры Еўропы з вокнамі на Усход і Захад, з выхадам на Поўдзень і Поўнач» [13]. Згодна з меркаваннем кіраўніка дзяржавы, такое размяшчэнне абавязвае супрацоўнічаць з усімі.

Падагульняючы, заўважым, што геапалітычны падыход да развіцця дзяржаў выявіўся яшчэ ў старажытнасці. З'яўляючыся неад'емнай часткай навакольнага свету, чалавек імкнуўся даследаваць уплыў прыродных (геаграфічных) умоў на жыццядзейнасць грамадства. Таму найбольш уплывовымі і фундаментальнымі пачынальнікамі геапалітыкі можна лічыць прадстаўнікоў менавіта геаграфічнай навукі: напрыклад, К. Рытэра. З цягам станаўлення геапалітыкі і з'яўлення яе даследчыкаў, яна пачала класіфікавацца ў адпаведнасці з акадэмічнымі школамі. Найбольш цікавай з'яўляецца руская школа, бо для яе характэрна спалучэнне філасофскай думкі з геапалітыкай у прамым яе разуменні. Зараджэнне геапалітычнай думкі ў Беларусі звязана з праблемамі нацыянальнай ідэнтычнасці і пошуку ўласнага шляху як нацыі і дзяржавы. На сучасным этапе геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь на афіцыйным узроўні ацэньваецца як спрыяльнае для правядзенне плённай знешняй палітыкі і рэалізацыі нацыянальных інтарэсаў.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Лао-цзы. Дао Дэ Цзин / Лао-цзы. — М. : АСТ, 2020. — 100 с.
2. Артхашастра («Наука политики»). — М. : Изд-во Акад. Наук СССР, 1959. — 793 с.
3. Монтескьё, Ш. Л. О духе законов / Ш. Л. Монтескьё. — М. : Мысль, 1999. — 674 с.
4. Кант, И. К вечному миру / И. Кант [Электронный ресурс] // Научная электронная библиотека. — Режим доступа: https://www.civisbook.ru/files/File/Kant_K_vechnomu_miru.pdf. — Дата доступа: 07.09.2023.
5. Краткий политический словарь. — М.: Политиздат, 1987. — 509 с.
6. Риттер, К. Землеведение Азии / К. Риттер [Электронный ресурс] // Библиотека русского географического общества. — Режим доступа: https://elib.rgo.ru/safe-view/123456789/211873/1/MTAwMDA3MzBfWmVtbGV2ZWRlbmllwqBBemlpIEdlb2dyYWZpeWEgc3RyYW4sIG5ha2hvZHlhc2hjaGlrLnBkZg==. — Дата доступа: 07.09.2023.
7. Пасс, А. В. Понятия и категории геополитики / А. В. Пасс // Вестн. Челябинск. гос. ун-та. — 2003. — № 1. — С. 312—326.
8. Curzon, G.N. Russia in Central Asia in 1889 and the Anglo-Russian Question / G. N. Curzon. — London : Longmans, 1889. — 477 p.
9. Бердяев, Н. А. Судьба России / Н. А. Бердяев. — М.: Философское общество СССР, 1990. — 251 с.
10. Абдзіраловіч, І. Адвечным шляхам / І. Абдзіраловіч [Электронны рэсурс] // Беларуская Палічка. — Рэжым доступу: https://knihi.com/Ihnat_Kanceuski/Adviecnym_slacham.html#r13. — Дата доступу: 07.09.2023.
11. Выступление Президента Республики Беларусь А. Г. Лукашенко «Внешняя политика Республики Беларусь в новом мире» на совещании с руководителями загранучреждений Республики Беларусь [Электронный ресурс] // Президент Республики Беларусь. — 22.07.2004. — Режим доступа: https://president.gov.by/ru/events/vystuplenie-prezidenta-respubliki-belarus-aglukashenko-vneshnjaja-politika-respubliki-belarus-v-novom-mire-na-5837. — Дата доступа: 09.09.2023.

12. Лукашенко: Беларусь заинтересована в неконфликтном и эффективном сотрудничестве с другими странами [Электронный ресурс] // БЕЛТА. — 24.11.2020. — Режим доступа: https://www.belta.by/president/view/lukashenko-belarus-zainteresovana-v-nekonfliktnom-i-effektivnom-sotrudnichestve-s-drugimi-stranami-417018-2020/. — Дата доступа: 09.09.2023.
13. Гришкевич, А. Лукашенко: находясь в центре Европы, мы всегда будем со всеми сотрудничать, но ни перед кем не преклоняясь / А. Гришкевич [Электронный ресурс] // БЕЛТА. — 09.08.2020. — Режим доступа: https://www.belta.by/president/view/lukashenko-nahodjas-v-tsentre-evropy-my-vsegda-budem-so-vsemi-sotrudnichat-no-ni-pered-kem-ne-402093-2020/. — Дата доступа: 09.09.2023.